# Станаўленне і развіццё суверэннай Рэспублікі Беларусь (1990-2015 гг.)

# 1. Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Распад СССР

# Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця






- Дэсталінізацыя –
  - рэабілітацыя ахвяр сталінскіх рэпрэсій – 130 тыс.
  - 14.06.1988 створана урадавая камісія па расследаванню месца масавага растрэлу у Курапатах

- Абуджэнне нацыянальнай свядомасці, цікавасць да мовы, гісторыі і культуры. Таварыствы “Талака”,





- У 1987-89 гг. адбываецца палітызацыя дзейнасці грамадскіх арганізацый, яны выступаюць з крытыкай палітыкі уладаў
- 30.10.1988 – “Дзяды” – масавае шэсце у Курапаты, якое было разагнана уладамі
- 1989 – стварэнне Беларускага народнага фронту





- Пасля адмены артыкула аб кіруючай ролі КПСС ствараецца новы орган улады – парламент – Вярхоўны Савет
- 1990 – Выбары ў Вярхоўны Савет БССР
- Старшыня Вярхоўнага Савета БССР – М. Дзямянцей



**Мікалай Дзямянцей**

У парламенце фарміруецца апазіцыйная фракцыя (дэпутаты ад БНФ)

- **27 ліпеня 1990** Вярхоўны савет БССР прымае **Дэкларацыю аб дзяржаўным суверынітэце БССР**
- *Беларусь абвяшчалася суверэннай дзяржавай, атрымала права на стварэнне ўласнага нацыянальнага банка і грашовай сістэмы, сваіх узброеных сілаў, права на заключэнне добраахвотных саюзаў з іншымі дзяржавамі.*
- Дата прыняцця гэтай Дэкларацыі была абвешчана Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

- “Парад суверэнітэтаў” патрабаваў вырашэння далейшага лёсу СССР
- **17.03.1991** – Усесаюзны рэферэндум аб захаванні СССР
- За захаванне Саюзу ў абноўленай форме (Саюз Суверэнных Дзяржаў) выказалася 76%, у БССР – 82,7%
- Падпісанне новага Саюзнага дагавору был прызначана на 20 жніўн 1991 г.



БЮЛЛЕТЕНЬ

для голосования на референдуме СССР

17 марта 1991 года

Считаете ли Вы необходимым сохранение Союза Советских Социалистических Республик как обновленной федерации равноправных суверенных республик, в которой будут в полной мере гарантироваться права и свободы человека любой национальности.

Оставьте один из указанных ответов, другой вычеркните

ДА НЕТ

Бюллетень в котором при голосовании вычеркнуты слова ДА и НЕТ или не вычеркнуты оба слова, признается недействительным.



- 19.08.1991 частка кіраўніцтва КПСС арганізавала спробу дзяржаўнага перавароту, мэта якога захаванне СССР і адхіленне ад улады прэзідэнта СССР М.С. Гарбачова



- Быў створаны Дзяржаўны камітэт па надзвычайным становішчы, які абвясціў а сваёй уладзе і ўвядзенні ў краіне надзвычайнага становішча



- 21 жніўня канстытуцыйная улада была аднаўлена, а КПСС забаронена

- 25.08.1991 – прыняты Закон “Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце БССР”
- 19.09.1991 – законы
  - “Аб назве БССР” – Рэспубліка Беларусь
  - “Аб дзяржаўным сцягу”
  - “Аб дзяржаўным гербе”





- Першым кіраўніком незалежнай Рэспублікі Беларусь стаў Старшыня Вярхоўнага Савета С.С. Шушкевіч
- Прэм’ер-міністр (кіраўнік ураду) Ф. Кебіч



**С. Шушкевіч**



**В. Кебіч**

- 7-8.12.1991 – кіраўнікі Расіі (Б.Ельцын), Украіны (Л.Краўчук) і Беларусі (С. Шушкевіч) падпісалі пагадненне аб спыненні існавання СССР і стварэнні СНД (Садружнасць Незалежных Дзяржаў)



- Ствараюцца узброеныя сілы РБ
- Уводзіцца уласная грашовая сістэма
- У парламенце вядзецца палітычная барацьба па вызначэнні палітычнага ладу дзяржавы: парламенцкая або прэзідэнцкая рэспубліка



- 15.03.1994 – прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь
- ***РБ абвяшчалася унітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай.***
- Вярхоўны Савет РБ з’яўляўся заканадаўчым органам дзяржаўнай улады, главой дзяржавы і выканаўчай ўлады станавіўся Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Беларусь абвяшчалася прэзідэнцкай рэспублікай.



- 23.06.1994 – першы тур выбараў Прэзідэнта РБ




**Аляксандр Дубко** (Аграрная партыя Беларусі)

**Вячаслаў Кебіч** (старшыня Савета Міністраў РБ)




**Аляксандр Лукашэнка** (дэпутат Вярхоўнага Савета, узначальваў камісію па барацьбе з карупцыяй)

**Васіль Новікаў** (Камуністычная партыя Беларусі)



**Зянон Пазняк** (Беларускі народны фронт)

**Станіслаў Шушкевіч** (старшыня Вярхоўнага Савета РБ)

- 10.07.1994 – у другім туры перамог А. Лукашэнка (80,43%, 56% з правам голаса)







# 2. Грамадска-палітычнае развіццё РБ у 2 пал. 1990-х – пач. XXI ст.

- У 1995-96 гг. адбываецца супрацьстаянне парламента і прэзідэнта
- Умацаванне прэзідэнцкай уладыі пашырэнне паўнамоцтваў прэзідэнта адбываецца праз стварэнне строга цэнтралізаванай сістэмы дзяржаўнага кіравання (“вертыкаль”) і унясенне змяненняў у Канстытуцыю ў 1996 і





Creative Commons

# Рэспубліканскія рэферэндумы

**14 мая 1995**

1. Наданне рускай мове роўнага статуса з беларускай
2. Устанаўленне новай дзяржаўнай сімволікі
3. Эканамічная інтэграцыя з Расіяй
4. Права прэзідэнта распускаць парламент

**24 лістапада 1996**

1. Унясенне паправак у Канстытуцыю, якія пашыралі паўнамоцтвы прэзідэнта
2. Перанясенне Дня незалежнасці на 3 ліпеня
3. Пытанне аб свабоднай куплі і продажу зямлі
4. Адмена смяротнага пакарання

**17 кастрычніка 2004**

Унясенне паправак у Канстытуцыю аб адмене абмежавання колькасці тэрмінаў прэзідэнцтва

# Прэзідэнт

гарант Канстытуцыі, правоў і свабодаў чалавека і грамадзяніна РБ; гарантуе рэалізацыю асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі; прадстаўляе РБ на міжнароднай арэне; прымае меры па абароне суверынітэту РБ; удзельнічае ў ажыццяўленні заканадаўства: выдае дыкрэты, якія маюць сілу закону і з’яўляюцца абавязковымі для выканання на ўсёй тэрыторыі Беларусі

***Распускае парламент***
***Прызначае выбары***

**Прызначае міністраў**

**Прызначае і вызваляе старшыню і 6 суддзяў Канстытуцыйнага суда**

***Заканадаўчая улада***

Парламент

**НАЦЫЯНАЛЬНЫ СХОД**

Верхняя палата – ***Савет Рэспублікі***

Ніжняя палата – ***Палата Прадстаўнікоў***

***Выканаўчая улада***

Урад

**САВЕТ МІНІСТРАЎ**

***Судовая ўлада***

**КАНСТЫТУЦЫЙНЫ СУД**

**Суды:**

Агульныя

Гаспадарчыя

Спецыялізаваныя

З 2-й паловы 1990 гг. пачаў дзейнічаць новы грамадскі інстытут – **Усебеларускі народны сход**

Яго функцыі: прыняцце пяцігадовых планаў

...я і

| | |
|---|---|
| **19-20.10 1996** | **I УНС**<br>Прыярытэтныя накірункі: экспарт, жыллё, харчаванне |
| **18.05 2001** | **II УНС**<br>Прыярытэтныя накірункі: ахова здароўя, інавацыйная і інвестыцыйная дзейнасць, развіццё АПК |
| **2-3.03 2006** | **III УНС**<br>Прыярытэтныя накірункі: развіццё навукаёмкіх галін, імпартазамяшчальных і экспартаарыентаваных вытворчасцей |
| **6-7.12 2010** | **Iv УНС**<br>Прыярытэтныя накірункі: развіццё чалавечага патэнцыялу, мадэрнізацыя, устойлівае развіццё рэгіёнаў |

# 3. Трансфармацы я эканамічнай сістэмы Беларусі

- З лета 1990 абвешчаны пераход да рынку, які прадугледжваў наступныя кірункі

1. ***Меры па стабілізацыі эканомікі*** (змяншэнне выдаткаў на дзяржапарат, капітальнае будаўніцтва, стрымліванне інфляцыі)
2. ***Раздзяржаўленне, прыватызацыя, дэманапалізацыя ўласнасці на сродкі вытворчасці, развіццё прадпрымальніцтва і канкурэнцыі*** (роўнасць форм уласнасці, акцыянаванне)






3. ***Стварэнне сістэмы дзяржаўнага рэгулявання эканомікай*** (праз Нацбанк, падаткі і г.д.)

4. ***Стварэнне рыначнай інфраструктуры і механізмаў яе дзеяння*** (біржы, банкі і г. д.)

5. ***Сацыяльная абарона насельніцтва ва ўмовах рыначнай эканомікі*** (мін.аплата працы, дапамогі па беспрацоўю і г.д.)

6. ***Пераадоленне вынікаў канстрофы на ЧАЭС ва ўмовах пераходу да рынку***

# *Тры этапы пераходу да рынку*

- **1.** этап надзвычайных мер (IV квартал 1990 – I квартал 1991)
- **2.** этап “захавання раўнавагі” – II квартал – IV квартал 1991)
- **3.** этап “пазітыўных зрухаў” – (I квартал – IV квартал 1992)
- Выканаць праграму пераходу да рынку не атрымалася, наступіў эканамічны крызіс

# Прычыны крызісу

- 1. Змена умоў дзяржаўнага існавання Беларусі
- 2. Змена умоў гаспадарання

# Асноўныя праявы крызісу

1. Спад вытворчасці ў асноўных галінах гаспадаркі
2. Рэзкае скарачэнне інвестыцый у асноўны капітал
3. Падзенне жыццёвага ўзроўню насельніцтва
4. Рост інфляцыі і беспрацоўя
5. Рост знешняй запазычанасці

- Эканамічны крызіс працягваўся да 1995 г.
- У 1996 г. прынята праграма пабудовы **сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі**
- Да 2000 г. прадугледжваліся два этапы:
- 1. 1996-1997 – дасягнуць макраэканамічнай стабільнасці, спыніць спад вытворчасці, знізіць інфляцыю, стабілізаваць курс нац. валюты
- 2. 1998-2000 – аднавіць эканамічны рост, прырост ВУП не менш як на 5% у год, рост жыццёвага узроўню насельніцтва

- З 1996 г. – высокія тэмпы росту і выхаду з крызісу, у 1998 г. тэмпы росту замаруджваюцца.
- Узмацняецца дзяржаўнае рэгуляванне эканамічнымі працэсамі
- З 2001 г. лібералізацыя эканомікі – стымуляванне прадпрымальніцкай актыўнасці, спрашчэнне працэсу рэгістрацыі і г.д.
- З 2005 прымаюцца Дзяржаўныя праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця: вёскі, рэгіёнаў, інавацыйнага развіцця

# Характэрныя рысы беларускай эканамічнай мадэлі

- 1. Дзяржаўнае рэгуляванне эканомікі, захаванне за дзяржавай ключавых галін прамысловасці
- 2. Стрыманая прыватызацыя
- 3. Плюралізм форм уласнасці і гаспадарання
- 4. Шырокія сацыяльныя гарантыі і дапамога слабаабароненым слаям насельніцтва
- 5. Нізкі узровень беспрацоўя і сацыяльная стабільнасць
- 6. Адсутнасць уласных энергарэсурсаў і залежнасць ад знешніх крэдытаў

# 4. Знешняя палітыка РБ

# Рэспубліка Беларусь (Беларусь)





Мяжуе з 5 краінамі: на
захадзе – з Польшчай (13,4 %
ад агульнай працягласці мяжы),
на паўночным захадзе – з
Літвой (15,6 %),
на поўначы – з Латвіяй (4,8 %),
на поўдні – з Украінай (32,8 %),
на паўночным захадзе,
паўночным усходзе і ўсходзе – з
Расіяй (33,4 %).

Па тэрыторыі – 84-е месца ў
свеце (207 600 км²), па коль-
касці насельніцтва – 87-е месца
ў свеце (9, 47 млн. чалавек).

# Асноўныя прынцыпы знешный палітыкі РБ

- Роўнасць дзяржаў
- Непрымяненне сілы або пагрозы сілай
- Непарушнасць межаў
- Мірнае ўрэгуляванне спрэчак
- Неўмяшанне ва ўнутраныя справы
- Захаванне агульнапрызнаных норм і прынцыпаў міжнароднага права

- Беларусь падтрымдівае дыпламатычныя адносіны са 166 краінамі свету, дзейнічае 44 пасольствы замежных дзяржаў
- Беларусь – нейтральная без’ядзерная дзяржава



Асноўныя задачы знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь
Абарона правоў і інтарэсаў беларускіх грамадзян за мяжой
Фарміраванне «пояса добрасуседства»
Садзеянне пазітыўнаму ўспрыняццю Беларусі ў свеце
Пераход ад аднапалярнага свету да шматпалярнага, справядлівае і дэмакратычнае светаўладкаванне
Папулярызацыя духоўных каштоўнасцей беларускага народа за мяжой

# Садружнасць незалежных дзяржаў

- Беларусь – краіна-заснавальніца СНД
- Мінск – сталіца СНД
- У СНД уваходзяць 11 дзяржаў





# Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі

**2.04 1997**

Дагавор аб саюзе Беларусі і Расіі

**8.12 1999**

Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі



# Эканамічнае супрацоўніцтва

- Еўразійскае эканамічнае  супольніцтва (ЭўрАзЭС) – 5  краін
- Мытны саюз – 3 краіны



# Арганізацыя дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ)



6 краін-членаў